ПАДЗЕЯ

# «СВЕЧА ГОРЕЛА НА СТОЛЕ…» У ГРОДНЕ АДЗНАЧЫЛІ 135-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ БАРЫСА ПАСТЭРНАКА



**20 лютага прыхільнікі творчасці вядомага паэта сабраліся ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. Макаёнка. Старонкі жыцця і няпростага лёсу Б. Пастэрнака, шчырыя эмоцыі, кранальныя лірычныя радкі і вядома ж, свечка, якая гарэла на стале… Атмасфера мерапрыемства нагадвала вандроўку на машыне часу на стагоддзе назад. Літаральна адчувалася, як пад дахам гродзенскай бібліятэкі лунае дух рускага паэта-філосафа.**

Сустрэча атрымалася сапраўдным святам для знатакоў узнёслага паэтычнага слова. І гэтае свята падарыла гродзенцам бібліятэкар установы культуры Іна Прасолава (на фота). Іна Арсеньеўна праявіла сябе сапраўдным экспертам, носьбітам глыбокіх ведаў пра жыццё і творчасць Барыса Леанідавіча. І шчодра падзялілася гэтым каштоўным скарбам. Слухачы пачулі падрабязны аповяд пра жыццёвы шлях паэта, які не быў абсыпаны пялёсткамі руж, хаця быў не пазбаўлены поспеху, усенароднага і міжнароднага прызнання, а ў фінале наогул абярнуўся сапраўднай трагедыяй.




Мерапрыемства, а фармат яго быў вызначаны, як літаратурная гасціная, нездарма назвалі словамі «Я понял жизни цель…». Перад аўдыторыяй паўстаў вобраз паэта, перакладчыка Барыса Леанідавіча Пастэрнака (1890-1960) у святле яго складаных філасофскіх пошукаў і шматлікіх памылак, шчырых пачуццяў і расчараванняў, на фоне бясконцых ілюзій і ўдараў лёсу. Пастаяннае імкненне да банальнага чалавечага шчасця і балючыя страты яго... Біяграфія Б. Пастэрнака

яшчэ раз даказвае сумную аксіёму: працэнт шчаслівых людзей сярод сур'ёзна захопленых паэзіяй, яркіх, таленавітых аўтараў, на жаль, вельмі невысокі. І кожны, хто ступіў на гэтую сцяжыну, павінен быць гатовы да такога раскладу. Нават аглушальны поспех, нават пазіцыя лідара савецкай паэзіі (пасля сыходу Есеніна і Маякоўскага) не прынеслі гармонію ў неспакойную душу творцы, многае ў жыцці якога было «не дзякуючы, а насуперак». Плюс няпросты характар, неадназначныя ўчынкі, масавая здрада сяброў, горкая крыўда і як следства невылечная хвароба. Такі ён, несалодкі хлеб непрызнанага генія. А сапраўдная народная любоў напаткала Б. Пастэрнака ўжо пасля яго перасялення ў вечнасць.

У ходзе мерапрыемства кожны жадаючы меў магчымасць прадэкламаваць свае любімыя творы Барыса Пастэрнака. Слова атрымалі і гродзенскія паэты. З прысвячэннямі класіку-юбіляру выступілі Наталля Чакліна-Гарбачова і Святлана Глембоцкая (на здымку). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык (на здымку) выказаўся пра творчасць Б. Л. Пастэрнака і адрасаваў цёплыя словы ўдзячнасці бібліятэкару Іне Прасолавай за вельмі ўдалае і надзвычай карыснае мерапрыемства.

Трэба адзначыць, што ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. Макаёнка для аматараў літаратуры горада над Нёманам рэгулярна ладзяцца тэматычныя сустрэчы, прысвечаныя юбілеям вядомых пісьменнікаў, іншым падзеям свету мастацтва. Напрыклад, у кніжніцы цікава ўшанавалі Ганну Ахматаву, Осіпа Мандэльштама, а летам лекцыйным выступленнем члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратуразнаўцы Святланы Тарасавай адзначылі векавы юбілей Васіля Быкава.

Розныя думкі прыходзяць на мерапрыемствах такога кшталту. Няпростыя нараджаюцца высновы. Чароўны, зіхатлівы свет мастацтва прыцягвае магчымасцю галавакружнага палёту, які можа спыніцца няўхільнай высокай платай за яго ў выглядзе раптоўнага падзення і смяротнага ўдару аб грэшную зямлю. Застаецца толькі свечка: гарыць і маўклівым сімвалам нагадвае нам пра нешта важнае.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас пасяджэння літаратурнай гасцінай «Я понял жизни цель…», прысвечанай 135-й гадавіне з дня нараджэння паэта Барыса Пастэрнака. Гродна, Цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. Макаёнка. 20 лютага 2025 года.



Бібліятэкар Іна Прасолава, вядучая мерапрыемства




Выступае член Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб’яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая






Выступае член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык






[www.pisateli.by](http://www.pisateli.by)